«*Мілай, таленавітай і мужнай Ніне Мацяш...*»

Як дарагую каштоўнасць захоўваюць аматары кнігі падарункі ад аўтараў з іх зычэннямі, словамі-пажаданнямі — кнігі з аўтографамі. Гэта і дарагі набытак бібліятэк, цэнтраў, у якіх адбываліся сустрэчы з аўтарамі, прэзентацыі іх кніг.

У архіве Ніны Мацяш шмат кніг, падораных ёй яе сябрамі-пісьменнікамі, з якімі мела шчырыя сяброўскія адносіны, а таксама і тых, хто меў за гонар падарыць ёй свой творчы набытак, спадзеючыся на яе ўвагу, на яе водгук, і не заўсёды кампліментарны, аднак спагадлівы, шчыры. Кожны, хто дасылаў ці аддаваў ёй у ручкі свой набытак, ведаў, што атрымае ад Ніны Мацяш яе слова, яе падтрымку, яе радасць ад новай кнігі.

Дарчыя надпісы на кнігах з архіва Ніны Мацяш адкрываюць нам поле пашаноты, удзячнасці і цеплыні яе сяброў, а таксама аматараў яе творчасці. Сярод іх — вядомыя беларускія пісьменнікі, у надпісах якіх найчасцей адрасуецца кніга *дарагой, мілай Ніне Мацяш*; *дарагой душы — светлай і высокай*; *светлай, чыстай і мужнай душы...* Сяргей Законнікаў называў Ніну Мацяш *дарагой сястрычкай,* Анатоль Вярцінскі — *духоўнай сястрой,* Ян Чыквін — *павечнай ластаўкай беларускай паэзіі.*

Нешматслоўныя дарчыя надпісы адкрываюць нам новыя штрыхі да творчых стасункаў Ніны Мацяш з беларускімі пісьменнікамі, сведчаць пра высокую ацэнку яе паэзіі, пра ўдзячнасць за цеплыню яе душы і сэрца, цеплыню яе мілай сонечнай усмешкі, за яе высокі і непаўторны песенны голас...

Кнігі дарагіх ёй людзей, іх лаканічныя дарчыя надпісы — выява іх шчырага захаплення яе творчасцю, яе мужным трываннем пасланых доляй выпрабаванняў. Аўтографы Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка, Ніла Гілевіча, Алеся Разанава і многіх іншых — гэта і знак мудрай падрымкі творчай асобы ў яе жыццёвых і творчых перажываннях. Выявай павагі і пашаны да Ніны Мацяш як да перакладчыцы сведчыць аўтограф Язэпа Семяжона, які на кнізе перакладаў паэзіі «Сем цудаў свету» выказаў ёй сваё слова павагі як да перакладчыцы высокага кшталту: «Ніне Мацяш з павагай, любоўю і надзеяй, што, сыходзячы з дыстанцыі, стары бягун перадае эстафету ў верныя рукі».

У аўтографах для Ніны Мацяш гучыць слова ўдзячнасці за «светлыню і цеплыню слова», за слова, здольнае адраджаць душы, за ласку сустрэчы з ёю, з яе творчасцю. І застаецца ў душы назаўсёды пажаданне Рыгора Барадуліна на кнізе «Рымскі дыпціх»: «Ніне Мацяш — Бог насустрач».

*Марыя Новік*